**Гаўрылаў І.**

# ПЕРАПРАВА ПРАЗ ДНЕПР

Стаялі апошнія дні верасня 1943 года. З перадавых пазіцый выразна была відаць у бінокль шырокая стужка Дняпра. Але цяпер гэтая спакойная і ціхая рака была непрыступнай. Фашысты заселі на правым беразе і бесперапынна пад прыцэльным агнём трымалі левабярэжжа. Капітана Ягора Арцёмавіча Юрчанку выклікаў камандзір палка і сказаў:

– Трэба наладзіць пераправу, таварыш капітан. Ведаю, што нялёгка. Але я спадзяюся на вас. Вопыт вы ўжо маеце...

Так, інжынеру . палка тав... Юрчанку неаднаразова даводзілася ў складаных франтавых умовах наладжваць пераправы праз малыя і вялікія рэкі. Вось у час фарсіравання Дзясны пад яго кіраўніцтвам пераправа была наладжана за кароткі час. За суткі ўсе падраздзяленні палка паспяхова пераправіліся на другі бок ракі.

На гэты раз перад капітанам стаяла надзвычай складаная задача. Да Дняпра ніяк нельга было падступіцца. Тады знаходлівы і смелы інжынер арганізаваў падрыхтоўку пераправы недалёка ад ракі, у гаі. Вечарам 26 верасня, калі сцямнела, Я. А. Юрчанка бясшумна пераправіў на правы бераг Дняпра першую групу смельчакоў. Назаўтра ноччу на другім бсразе была ўжо ўся рота, якой камандаваў старшы лейтэнант тав. Ляшэнка. Адважныя байцы стойка трымаліся на невялікім участку зямлі правабярэжнай Украіны. Ноччу 28 верасня быў зроблен прычал, пачаў працаваць паром. На правы бераг Дняпра пад прыкрыццём роты т. Ляшэнкі пачалі перапраўляцца стралковыя батальёны, мінамёты і артылерыя. Немцы імкнуліся перашкодзіць, але было ужо позна. Свежыя падраздзяленні байцоў прама з пераправы ўступалі ў бой. Гітлераўцам прыйшлося адступаць. Прыдняпроўскія ўмацаванні, якія вораг лічыў непрыступнымі, былі прарваны.

У гэтым баі капітана Я. А. Юрчанку параніла. Але ён не пакінуў пярэдняга краю, кіраваў пераправай да таго часу, пакуль не прыбыў яму на змену новы інжынер палка.

За праяўленую смеласць і адвагу, за выдатнае выкананне баявога задання Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР 29 кастрычніка 1943 года прысвоіў Ягору Арцёмавічу Юрчанку званне Героя Савецкага Саюза.

Гэта толькі адзін з франтавых эпізодаў камуніста Я. А. Юрчанкі, які нарадзіўся і вырас у вёсцы Палыкавічы. Хлебаробы калгаса імя Камінтэрна ганарацца сваім земляком, памнажаюць яго славу на фронце мірнага будаўніцтва.

**Гаўрылаў, І. Пераправа праз Днепр / І. Гаўрылаў // За камуністычную працу (Магілёў). — 1965. — 23 лютага. — С. 2.**